Источник: "Краязнаўчая газета" - 2012-03-23

# Малая краязнаўчая энцыклапедыя

*(Пачатак у № 1 за 2003 год)*

**МАЖО́ЙКА** Зінаіда Якаўлеўна (н. 06.12.1933, г. Орша) – беларускі этнамузыказнаўца, кандыдат мастацтвазнаўства (1971), заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (1987). З 1962 г. працавала ў Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (пазней – НАН Беларусі). Распрацоўвае тэарэтычныя праблемы сістэмнай тыпалогіі і мелагеаграфіі песенных жанраў, метадалогію арэальных даследаванняў, экалагічныя праблемы традыцыйнай культуры (цэнтральная тэма – фальклор і сучаснасць). Музыказнаўчы аспект у яе працах арганічна спалучаецца з мастацтвазнаўчым, гістарычным, этнаграфічным, сацыялагічным. У галіне практычнай фалькларыстыкі – прапаганда аўтэнтычных песенных формаў на навуковым узроўні: арганізацыя музычна-этнаграфічных канцэртаў (у т.л. на 7-м Міжнародным музычным кангрэсе ў Маскве, 1971), выпуск грампласцінак (сярод іх «Музычны фальклор Беларускага Палесся», выдадзены ЮНЕСКА ў серыі «Музычны атлас народаў свету», 1982), стварэнне сцэнарыяў навукова-папулярных музычна-этнаграфічных фільмаў («Палескія калядкі», 1972; «Галасы вякоў», 1979; «Памяць стагоддзяў», 1982; «Палескія вяселлі», 1986). Выступала з дакладамі на міжнародных навуковых канферэнцыях у Мінску, Маскве, Таліне, у Балгарыі, Югаславіі. З 1972 г. – член бюро Усесаюзнай фальклорнай камісіі Саюза кампазітараў СССР, з 1987 г. – старшыня фальклорнай камісіі Саюза кампазітараў БССР. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1994).



**МАЗУ́РКА** (польск. mazurek, mazur, ад назвы жыхароў Мазурскага рэгіёну Польшчы) – польскі народны танец. Музычны памер $^3/_4$ ці $^3/_8$. Тэмп ад умеранага да хуткага. На беларускіх землях пашыраны з XIX ст., спачатку ў горадзе, потым у вёсцы. Можа выконвацца неабмежаваная колькасць параў. Асноўны малюнак – круг. Для мазуркі, што выконваецца ў Беларусі, характэрны рытмічны мяккі бег. Танец пашыраны па ўсёй Беларусі, асабліва ў Гродзенскай і Віцебскай абласцях.

